Download

Вясна | Брэст
Forwarded from Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Жыхара Баранавічаў асудзілі на год «хіміі»: «Праявіў паказную смеласць і дзёрзкія паводзіны — сарваў дзяржаўны сцяг і пакінуў яго на лаве»

У судзе Баранавічскага раёна і г. Баранавічы 30 жніўня разглядзелі крымінальную справу ў дачыненні да 21-гадовага **Валерыя Нямкевіча**, якога вінавацілі ў здзеку над дзяржаўным сцягам.

Пракурорка **Святлана Пасемка** зачытала абвінавачванне, згодна з якім 17 красавіка Валерый меў намер на здзек і імкненне публічна прадэманстраваць сваё непаважлівае стаўленне да дзяржаўных сімвалаў, у прысутнасці старонніх грамадзянаў праявіў паказную смеласць і дзёрзкія паводзіны — сарваў са сцяны ЖРЭА разам з кранштэйнам дзяржаўны сцяг, пранёс яго да лаўкі насупраць Дома гандлю «Вясёлка» і пакінуў там. Дзеянні абвінавачанага былі кваліфікаваныя па арт. 370 КК.

Суддзя **Сяргей Данільчык** палічыў віну Нямкевіча даказанай у поўным аб'ёме і **асудзіў яго на адзін год абмежавання волі з накіраванне ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу**.
t.me/viasna_brest/1379
643 viewsAug 30, 2021 at 17:22

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy